Яўген Калашнікаў

Дзе падзеліся цукеркі?

Сам з вусамі



БЛІЗНЯТЫ

Неяк летам, у добры час,
Бусел завітаў да нас

І прынёс да нашых хатак
Двух прыгожанькіх блізнятак.

Пакружыўся, азірнуўся —
І на ганку апынуўся.

Моўчкі, без ніякіх гукаў,
Ён паклаў іх мне на рукі.

Памыліўся, мабыць, бусел?
Мо яшчэ камусьці мусіў?!

Ён жа крылы распрастаў
І праз момант, як растаў.

З вышыні ўжо кляцаў дзюбай:
— Гэй! Прымай блізнят, галуба!

Не здзіўляйся, хлопец, надта,
Будзь сястрыцам добрым братам!

Так з'явіліся сястрычкі —
І Таццянка, і Марычка.

ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Урачыста адзначалі
Васьмігоддзе Юля з Галяй.

Торт для Юлі, торт для Галі
Мама з татам гатавалі.

У кожным торце восем свечак,
Дзьмі, маленькі чалавечак!

Сяброкі ім пажадалі,
Каб усюды шанцавала!

А сяброўчкі іначай —
Каб ва ўсім была удача!

Толькі Юлю часам Галяй
Хлапчукі ўсё называлі.

Юля з гэтае нагоды
Разам страціла лагоду.

І на вушка Галі ласкава
Кажа ёй: «Мая ты ластаўка,

Я цябе, мая сястрычка,
На вяселле не паклічу!

Раптам і жаніх падчас
Будзе блытаць, хто дзе з нас!»

У ГОСЦІ ДА БАБУЛІ

Дзве блізняткі Галя з Юляй
Едуць у госці да бабулі.

Дзед з бабуляй іх паклікалі
Адпачыць на ўсе канікулы.

Дзед адразу, паступова
Ставіць дзевачкам умову:

— Не хадзіць адным на рэчку,
Гэта вельмі небяспечна!

Паасобку не хадзіць,
Можна лёгка заблудзіць!

Без мяне ў лес ані кроку,
Адыходзіць недалёка!

Па дарозе не бадзяцца! —
Павучае іх дарадца.



Дзеда слухаюць дзяўчынкі,
У вачах блішчаць слязінкі.

Ледзь не плачуць Юля з Галяй:
— Дзед! Мы што, у палон папалі?

ДЗЕ ПАДЗЕЛІСЯ ЦУКЕРКІ?

Мама кліча: «Пеця, Віця!
Вось дык дзіва! Паглядзіце!

Помню гэта дасканала:
Я ж сюды цукеркі клала!

Учора шмат было цукерак,
А цяпер — ані паперак!

Ты не браў іх у буфеце?» —
Пацікавілася ў Пеці.

«Не, не браў», — сынок сумеўся
І крыху зачырванеўся.

«А я нават і не бачыў», —
Віця коратка зазначыў.

«Гэта ж трэба, — кажа маці, —
І куды магла пакласці?!

Бачу толькі дзве цукеркі
Вось за гэтаю талеркай».

Са здзіўленнем Пеця кажа:
«Як жа я іх не заўважыў?»

І, прызнаўшыся, што з'еў,
Ён зусім пачырванеў.

КАГО ЛЕПШ ЗАВЕСЦІ?

— Мама, можа нам завесці
Яшчэ хлопчыка Кірыла?
— Вой, сыночак! Дай хоць сесці!
Ажно дух перахапіла!

Што надумаў ты такое?
Каб хаця яшчэ дзяўчынку...
Мне, Максім, з адным табою
Ні ўпынку, ні прыпынку.

— А давай тады, мамуля, —
Скочыў радасна Максімка. —
Завядзём Алену з Юляй —
Гэта з садзіка дзяўчынкі!

ФІТАНЦЫДЫ Ў САЛАЦЕ

— Кушай, дзетачка, салату, —
Просіць Каценьку бабуля.
— Не, — гаворыць Каця ўпарта, —
Там часнок і шмат цыбулі.

— Фітанцыды ж ад цыбулі
Забіваюць усіх мікробаў.

Усіх чыста, нібы кулі,
І карысны для вантробаў.

— Не, бабуля, адназначна —
Раз карысна, то нясмачна.
Без мікробаў і салата,
Што без цукару гарбата.

Як мікробы ўсе загінуць,
Застануцца фітанцыды. —



Каця глянула з агідай.
— Не хачу я фітанцыдаў!

Ды і дохлыя мікробы
Мне зусім не даспадобы.
Лепш бы гэтая брыгада
Гінула ад шакаладу!

ЯК РАЗМАЛЯВАЦЬ ВЯСЁЛКУ?

Дождж прайшоў, і на нябёсах,
Быццам нехта вельмі дужы,
Выткаў на чароўных кроснах
Каляровае паўкружжа.

Ці то казачным алоўкам,
Не забыўшыся нікалькі,
З году ў год малюе лоўка
Ўсе сем колераў вясёлкі.

Каб запомніць іх парадак
І ніколі не забыцца,
Зараз дам адну параду —
Два радочкі завучыце:

Чароўна, апантана жаўрукі
Звіняць бясконца спевам файным.
Так з лёгкае мае рукі
Чарговасць іх не будзе тайнай.

САМ З ВУСАМІ

Ну вось, любы мой Мікола,
Хутка пойдзеш ты ў школу,

Будзеш там пісаць, чытаць
Ды навукі вывучаць,

Каб пасля вучоным стаць,
Нават у космасе лятаць!

— Не, — адказвае Мікола, —
У школу не пайду ніколі.
Мне там будзе нецікава, —
Кажа хлопчык маме жвава, —

Бо я вельмі вумны штосьці,
І разумны не па ўзросце.

— Хто ж сказаў, што ты разумны?
— Сам я ведаю! Я ж вумны!

НЕ, МАМУЛЯ...

Мама спаць кладзе малога,
Ціха песню напявае,
Казкі, пра яго самога,
Пра лісічку выдумляе...

— Спі, сыночак! Спі, мой родны!
Над табою сон лунае,
Сон цікавы і лагодны,
Спаць хачу ўжо і сама я.



Мо табе ўжо зайка сніцца? —
Ціхенька пытае мама. —
Ці то хітрая лісіца?
— Не, мамуля, шчэ рэклама...

ТАПКІ

Тапкі — вельмі ёмка ў хаце,
Ды ўзнікае абурэнне:
Дзе іх раніцай шукаці?!
Ну, ніякага сумлення!

Знікнуць некуды са спальні,
Быццам бегаюць на лапках...
Гэта ж проста абуральна!
Хоць ты спі ў гэтых тапках!

ПРАЎДА, ЦІ НЕ?

— Праўда, мамачка, ці не,
Што ў капусце нас знаходзяць?
У садку ж казалі мне,
Што ад малпы ўсе паходзяць...

— Так, дачушка! Так, ад малпы!
Ад яе ўзялі пачатак...
Наш далёкі продак малпа,
Увесь народ яе нашчадак.

— Значыцца ў людзей, матуля,
Малпа прапрапрабабуля?..
А ў цябе няма партрэта,
Ці то фоткі малпы гэтай?

ПАМОЧНІК

Слава дрэмле ў крэсле з кніжкай,
А сястрычка Вера лоўка
І рупліва, быццам мышка,
Завіхаецца з уборкай.

Дабралася і да Славы:
— Падымі-ка, братка, ногі, —
Просіць Славіка ласкава, —
Я крыху пратру падлогу.

Кажа хлопец ёй: «О, Божа!
Без маёй ты дапамогі
І падлогу мыць не можаш.
Давядзеш мяне да змогі!»

ЧАМУЧКА

Мікітку мама ў сад збірае,
Куртку, шапку надзявае.

Ды спяшаецца! Баіцца —
На работу б не спазніцца!

Не папіўшы і гарбаты,
Урэшце выскачыла з хаты

І пабегла на прыпынак,
Падхапіўшы свайго сына.

Ён сказаць імкнецца нешта,
Ды «чамуськаў» вельмі смешна.

Усё «чаму, чаму» лапоча...
Мо спытаць аб нечым хоча?

Ды не да размовы ж маме —
Сын — аж дзесяць кілаграмаў!

Адмахнулася сярдзіта:
«Памаўчы крыху, Мікіта!»

Як ускочыла ў маршрутку,
Кажа сыну праз мінутку:

— Што ты ўсё цягнуў — «чаму?»,
Я цяперака пайму.

А Мікітка ёй у адказ:
— Я цікавіўся штораз,

Чаму сёння вы з бабуляй
Мне чаравічкі не абулі?

НАВОШТА ДЗЕДУ ЕЖА?

— Еш, Сярожа, еш, мой дружа,
Каб расці вялікім, дужым, —

Кажа хлопчыку бабуля, —
Паглядзі, як есць дзядуля!

Але ж есці ён не хоча
І гарэзліва рагоча:

— А навошта дзеду есці?
Не расце ж, хоць колькі з'есці!



ЦЫРК

Цырк для нас заўсёды свята!
Малпы, тыгры, акрабаты!

Круцяць гіры сілачы,
А мартышкі-цыркачы

Выкідаюць конікі
Лепш за іншых комікаў.

У цырку мы ад смехаты
Надрываем жываты.

КУПІЦЕ МАЕ ПАПУГАЯ

— Мам, купі мне папугая! —
Ён харошы ды прыгожы! —
Румзае малая Мая, —
Нават размаўляці можа!

— Што харошы, то харошы.
Але ж вось бяда якая:
Дзе ж узяць такія грошы,
Я зусім не уяўляю!

— Дык пайшлі ў банк хутчэй!
Мне казаў сусед наш Лёша —
Там добры дзядзька казначэй,
Там заўсёды многа грошай!

Падказала маме Мая:
— Бяры грошай колькі трэба.
Вось і купім папугая,
Мо яшчэ і ляльку Бэбі!

ЭЛЬФ

Я пра Эльфаў чуў быліны,
Чуў расказы ад вучоных,
Што ў Ісландыі-краіне
Розных Эльфаў незлічона.

Знаўцы кажуць: «Эльфаў мноства —
Існуе трынаццаць відаў!
А знайсці між тым не проста —
Тое знаюць толькі гіды.

Нават школа там сцвярджае:
Эльф — лагодны чарадзей,
Зла нікому не жадае,
Ён прыязны да людзей.

Вынаходнік

АРОЛ

Ускудлачаны, мурзаты,
Васілёк прыбег дамоў,
А настрой такі прыўзняты,
Хоць каленкі збіты ў кроў!

Бацьку хваліцца хлапчына:
«Я забіў сягоння гол!»

Кажа бацька: «Малайчына!
Ты ў мяне, сынок, арол!»

«Дык вы выйгралі сустрэчу?» —
Засмуціўся арол-сын.
Чырванее твар хлапечы:
«Не, прайгралі... Ноль — адзін...»

АГЕНЬЧЫК

Агеньчык вясёлы
З запалкі саскочыў
І ў наваколле
Адразу пакрочыў.

Які ён прыгожы!
Але ж разгарыцца —
З агеньчыка можа
Пажар утварыцца.

Мой дружа! Хвалюйся!
З агнём не жартуй!
Не дужа любуйся —
Прыроду ратуй!

АНЁЛ

Анёл — наш дзіўны абаронца,
Усё жыццё ён разам з намі.
Яго любоў, прыязнь — бясконцы,
Ён песціць нас, нібыта мама.

Ён — захавальнік ад нягоды,
Падкажа правільны кірунак,
Ён — лепшы сябра назаўсёды,
Анёл — ад Бога падарунак.

ВЯСНОВЫ НАСТРОЙ

Настрой вясновы,
Настрой прыўзняты,
І я вясёлы
Ідy дахаты.

З-пад снегу стужкі
Вады струменяць,
На дрэвах птушкі
Вясну праменяць.

І жмураць вочы
Каты пад плотам,
Па свеце крочыць
Вясновы клопат.

Ручай руплівы
Аббег каменьчык,
Далей шчаслівы
Бяжыць струменьчык.

Настрой вясновы,
Настрой прыўзняты,
І я вясёлы
Іду дахаты.

ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?

— Не пайду я больш у школу, —
Кажа маці першакласнік.
— Вой, што здарылася, Коля?
Нешта мне зусім не ясна!

Ты ж быў вельмі-вельмі рады,
Як пайшоў у першы клас,
І таму не дам я рады —
Што ж то здарылася ў нас?

— Я ж не ўмею шчэ пісаць,
А мяне там прымушаюць.
А ўмею размаўляць —
Размаўляць не дазваляюць...

ВОСЬ ГЭТА РЫБАЛКА!

Пераклад верша В. Вятошкіна

Сабраліся кот з Іванкам
Парыбачыць на заранку.

Сніўся Ваську той жа ноччу
Добры, тлусты акунёчак...

І — ура! З самога рання
Здзейсніліся ўсе чаканні!

Рыба торкала заўзята...
Для ката ж такое свята!

Звыш усіх яго надзей
Быў сапраўдны рыбны дзень!

То карась, то судачок
Ім траплялі на кручок.

Ваня лоўка іх здымае —
Кот з'ядаць не паспявае.

Ох, Іванка і смяяўся,
Гледзячы, як спатыкаўся

І цягнуў дамоў жывот
Па пяску абжора-кот.

ПАШАНЦАВАЛА

Васільку пашанцавала —
Рыбку дзіўную злавіў.

І яна паабяцала,
Каб ён толькі адпусціў,

Нават зараз жа, уранні,
Выканаць яго жаданні.

Вельмі ўзрадаваўся хлопча
І пачаў лічыць, што хоча:

— Скутар — раз, круты мабільнік,
Спінінг, плэер ды гадзіннік,

У дзённік лепшыя адзнакі,
Кожны дзень хачу прысмакі, —

Загінае пальцы Вася, —
Каб быў самым дужым у класе...

Ад напружання спацеў
І прадоўжыць шчэ хацеў...

Рыбка ж залямантавала:
— Вася! Гэта ж бессаромнасць! —
І яна ледзь не сканала,
Раптам страціўшы прытомнасць.

ВЫНАХОДНІК

Насміхаўся з сябра Вася:
— Ты нашто гэта, Ілюха,
Бачу я апошнім часам,
Заляпляеш скотчам вуха?

— Ну, чаго, Васіль, рагочаш?
То ж настаўніца сцвярджае,
Што ў вуха мне ні ўскочыць,
То ў другое вылятае.

Я адно сказаць магу
(Мне самому так здаецца):
Можа быць, цяпер у мазгу
Хоць што-небудзь застанецца!

ГАДЗІННІК

Мне заўжды гадзіннік
Кажа колькі часу.
Ён жа і будзільнік —
Будзіць раннім часам.

І такі звінючы!
Ён мне надакучыў!



БУДЗІЛЬНІК ВІНАВАТЫ

Дакарае мама Колю:
— Як не сорамна, сынок!
Сёння зноў спазніўся ў школу,
Прагуляў увесь урок...

— То ж мяне падвёў будзільнік,
Бо забыў званіць уранні!
Вінаваты ён, гадзіннік!
Да яго ж усе пытанні!

КАЗЁЛ АДПУШЧЭННЯ

Неяк стараста Мікола
Абвясціў, што ў хуткім часе,
На наступным тыдні, у школе
Будзе конкурс лепшых класаў.

«Каб усе былі ў нядзелю,
Будзем мыць і прыбіраць.
Мы ж даўным-даўно хацелі
Месца першае заняць.

І прашу я прабачэння:
Працаваць — дык усім класам!

Не казёл я адпушчэння,
Каб рабіць усё сам-насам».

Мы сумеліся з прамовы,
Бо ніхто ж не адмаўляўся!
Працаваць усе гатовы,
Дык чаму ён так напяўся?!

А ў нядзелю, у спачынак,
Ён, зусім без засмучэння,
Знік праз некалькі хвілінак...
Знік «казёл наш адпушчэння».

Вось тады мы зразумелі:
Пазнаюцца ў справах людзі,
А Мікола — пустамеля!
Больш ён старастам не будзе!

НЕ СЯБРЫ МЫ...

Неяк бачу: на пляцоўцы,
Нібы пеўні, скачуць бойка
Невялічкія два хлопцы —
Не на жарт вядзецца бойка.

— Як не сорам, хлопцы, біцца,
Быццам дзікія зубры?!
Прапаную — памірыцца!
Вы ж, я думаю, сябры?

Супыніліся адразу,
Паразявіўшы раты.
Успрынялі як абразу:
— Не сябры мы, мы — браты!



ТОЛЬКІ ПРАГУЛЯЎСЯ

— Ты чаму такі калматы? —
Васіля спытаў важаты.
— Мо ізноў хадзіў на рэчку?
Я ж забараніў, дарэчы.
— Не-не-не! — хлапец злякаўся, —
Я там толькі прагуляўся.
— У цябе ж яшчэ, Васіль,
Не прасохлі валасы...
— То ж я раптам спатыкнуўся,
Ды ў рэчцы апынуўся.
— А чаму штаны сухія?
Мабыць, ты надзеў другія?
— Не! Я зняць паспеў штаны,
Каб не вымаклі яны.

НЕ ПРЫХОДЗЬ БЕЗ БАЦЬКІ

— Да якой пары, Мікола,
Будзеш ты спазняцца ў школу?

Мо чытаў ты да світанку?
Ці не выспаўся да ранку?

А была ж нядзеля ўчора!
Ну не вучань — проста гора!

І наогул, на ўроку
Ад цябе не надта проку.

Хопіць нам гуляць у цацкі,
Заўтра не прыходзь без бацькі!

— Добра, з вашага дазволу,
Не пайду я заўтра ў школу!

ПАДАРУНАК

— Вой, як сорамна было мне
Выслухоўваць пры народзе
Вашай класнай абурэнне
Сёння, на бацькоўскім сходзе.
Гэта ж трэба! Як ніколі —
Нараканняў, скаргаў многа...
Вось чаму не быў ты ў школе? —
Кажа Вову бацька строга.

— Дык я зведаў выпадкова,
Што ў яе дзень нараджэння, —

Сумна кажа бацьку Вова, —
Вось і ўзнікла азарэнне:

Каб яе не нерваваць,
Будзе лепей, відавочна,
Мне ў парку пагуляць
У гэты дзень яе святочны.

ХОВАНКІ

На ўскрайку лесу дзеці —
Васіліна, Юра, Пеця,

Коля, Каця, Ніна, Валя —
Дружна ў хованкі гулялі.

Гулялі — не журыліся,
Па чарзе жмурыліся.

Пецю выпала шукаці,
І яму на вушка Каця:

— Калі зможаш адшукаць,
Можна і пацалаваць!

— Ну, а як не адшукаю? —
Пеця хуценька пытае.

— Вой, — сумелася дзяўчынка, —
Буду ж я за той ялінкай...

ШЧУПАК

Набраць вады зімовым ранкам
Да ракі прыйшоў Іванка.

Незнарок Іванка храбра
Шчупака злавіў за жабры.

А шчупак з тае прычыны
Слёзна стаў прасіць хлапчыну:

«Адпусці мяне, Іване!
Абяцаю: усе жаданні

Па твайму хаценню,
Па майму вяленню

Будуць споўнены імгненна,
І выдатна, і адменна!

Толькі скажаш гэта ўпотай —
І пайшла кіпець работа».

Адпусціў Іван нябогу
І пакрочыў у дарогу.

Шчупаку ж было цікава:
Чым закончылася справа?!

І які ж там будзе плён?
Паглядзеў з палонкі ён.

Бачыць — вёдры зухавата
Самі гойсаюць дахаты.

Паківаў услед шчупак:
«Ну, Іван, ты і лайдак!»

ЧАРОЎНАЕ СЛОВА

Нешта ў кухні смажыць мама,
Просіць сына Аляксея:
— Збегай, мой сынок, у краму
І купі мукі, алею.

А сыночак у камп'ютар
Утаропіў свае вочы.
Ледзьве сам не ўлез унутр —
Адрывацца ён не хоча!

І, каб выйграць часу пэўна,
Аляксей насупіў бровы:
— Мам! Забылася, напэўна,
Папрасіць з чароўным словам?

— А, дык ты ісці не хочаш?
Інтэрнэт я адключу...
Аляксей адразу скочыў:
— Ды лячу, лячу, лячу!

БУСЕЛ

— Што ты, бусел, па чарзе
На адной стаіш назе?

Вельмі мне цікава гэта.
Захапляешся балетам?

— Дужа многа хочаш знаць!
Мне так лепш адпачываць!

ВЕРАБ'І НА ПРАВАДАХ

Вераб'і на правадах,
Нібы ноты ў нотным сшытку,
Быццам нехта гэтых птах
На кіліме дзіўным выткаў.

Ластаўка ў фрачнай пары,
Як выдатны дырыжор,
Кіравала без фанфараў
І спяваў птушыны хор.

Ды харыстам не хапала
Салавейкі-запявалы,
І таму недасканала
Спевы іхнія гучалі.

ЛАСТАЎКА

Ластаўка-касатачка,
Наша прыгажуня!
Пра надвор'е, пташачка,
Раскажы, красуня!

Ты ж па свеце, ўшыр і ўдоўж
Лётаеш высока.
То скажы, ці будзе дождж,
Ці чакае спёка?!

Ластаўкі ж смяюцца:
«Кажуць у народзе,
Калі птушкі ўнізе ўюцца —
То ж быць непагодзе».

ШПАК-СПЯВАК

Як у садзе ёсць шпакоўня —
Будзе ў садзе яблык поўна.

Я заўжды шпакоўню тую
Да прылёту рамантую.

Птушкі клопат мой адчуюць —
Сад ад вусеня ўратуюць.

І спявае шпак прыгожа,
Нават як салоўка можа.

Ён цудоўны выканаўца,
Розных моў выдатны знаўца.

Часам ён вядзе размову
І на іншаземнай мове.

Чуў я нейк на адвячорку
Афрыканскую гаворку.

Ён як жаба можа квакаць,
І забрэша, як сабака...

Вось такі ён, шпак, пацешны —
Гэта птушка-перасмешнік.

Толькі ж больш на золку рана
Ён «фьюіць» пяе старанна.

Днём жа трэба працаваць,
Птушкам некалі спяваць!

ЙЕС!

Неяк летам выпадкова
Папугай з'явіўся ў Вовы.

Ён адразу ў папугая,
Не марудзячы, пытае:

— На размову ты аматар?
— Йес, — адказвае пярнаты.

— Дык скажы, як цябе звацi?
— Йес, — гучыць англійскі у хаце.

— Ці ж ты ўмееш гаварыць?
— Йес, — ізноў адказ гучыць.

— Што табе за інтарэс
Тараторыць «йес» ды «йес»?

— Вова, ты як цёмны лес,
«Так» — то па-англійску «йес».

І запамятай, дзівак,
Што мяне і клічуць так.

— Вось выдатна! — кажа Вова. —
Атрымалася размова!

ЧАМУ БУСЕЛ СТАІЦЬ НА АДНОЙ НАЗЕ?

На адной назе стаіць
Задуменны бусел,
Пільна ў лужыну глядзіць —
Вудзіць рыбу, мусіць.

Бег баран — стаў бы ўкапаны:
— А чаму ты па чарзе,
Як салдацік алавяны,
На адной стаіш назе?

— Дык калі другую ўзняць
У гэты ж час, галубе,
Мне патрэбна ці лятаць,
Ці стаяць на дзюбе!

ЯШЧАРКА

Яшчарыца прыткая —
Вельмі асцярожная,
І зусім не брыдкая,
Нават і прыгожая.

А знайсці красуню можна
Ўсюды на Палессі —

Яна вельмі асцярожна
Бегае па лесе.

А як хто за хвост ухопіць,
Дык яна яго адкіне.
Кажа: «Вось табе і хопіць» —
Хвосцік ворагу пакіне.

А сама пад горку,
Ды хутчэй у норку.

НАШТО ЁЙ ГРОШЫ?

Хто не ведае сароку,
Стракатунню-белабоку?

Пра яе ў кнігарні — звязак
Баек, прымавак ды казак:

То як дзеткам кашку варыць,
Як з сяброўкамі пляткарыць,

Ды як гнёзды віць вучыла,
Як каралі падарыла...

Сумнай птушка не бывае,
Бо вясёлы нораў мае.
А падслухае сакрэты —
Разнясе па белу свету.



Ды яшчэ, я чуў калісьці,
Ад сарокі шмат карысці.

Для жукоў ды грызуноў
Птушка горш за бізуноў.

Але ж гэта дабрадзейка —
Часам простая зладзейка.

І, калі заўважыць дзесьці, —
Сцягне цвік, гадзіннік, персцень.

Красці штось бліскучае
Ёй не надакучвае.
Нават школьнікам вядома:
Што блішчыць, нясе дадому, —

То пятак, рубель не горшы...
А нашто сароцы грошы?

Мае ўжо ж адзін гадзіннік!
Мо збірае на мабільнік?

СВЕЦІНЫ РЫБКІ

У акварыуме рыбкі —
Гупі, Сомікі, Каметы —
Ды задзіра Пеўнік Прыткі
Цераз шкло глядзяць на Свету.

За вячэрай просіць Света:
— Мам, накрый ты іх сурвэткай,

Заслані хутчэй ад свету.
— А навошта, мая дзетка?

— Дык жа рыбкі нас асудзяць!
Плаўнікі пастануць дыбам,
Як убачаць, што мы будзем
Есці смажаную рыбу.

І, разгубленыя, скажуць:
«Мо яны і нас засмажаць?»

РАЗУМНІК

Кажуць людзі: усё жывое
Выйшла з мора-акіяна.
Так лічыў і Ясь пра тое:
Ведаў ён дзяўчынку Яну —
Слёз выточнік пастаянны.
Льюцца слёзы з яе, быццам
З невычэрпнае крыніцы.

Ды зусім не ўсе схацелі
Выйсці з мора-акіяна.
Асятры, кіты, макрэлі,
Афаліны ды фарэлі —
Усе вадой замілаваны.

І хаця ў ёй небяспечна,
Засталіся там навечна.

Зацікавіўся хлапчына:
А адкуль, з якой прычыны,
Аб'явіўся род птушыны?

Можа, пара вадзяная,
Што ўзнялася з акіяна,
Розных птушак учыняе
Так дыхтоўна, так старанна?

Вось яно! Яны ўзнікаюць
З воблачнае пары!
І, шчаслівыя, лунаюць
З воблакам на пару.

І падумаў ён аднойчы,
Гэты мой разумны хлопчык:

«З чаго ж татка ўтварыўся?
(Учора з ім ён пасварыўся.)
Можа, татка паявіўся
З хмаркі невялічкай?
Не, здаецца, памыліўся —
З хмары навальнічнай!

Мо і нашы мамы
Створаны таксама
Ці з аблокаў, ці то з пары,
Ці з паветра, ці то з хмары?»

— Не! — рашуча мовіў Яська. —
Мамы — з цеплыні ды ласкі!

Мамы нашы — светлыя агеньчыкі!
З сонечных ствараюцца
праменьчыкаў!

ЖАЛЬБА

Сядзіць на ланцугу Барбос
І скардзіцца на цяжкі лёс:

— Вось так на ланцугу сядзіш,
На волю ў шчыліну глядзіш,

А там жа — так жыццё кіпіць!
І кожны, кожны з мяне кпіць,

Мяне імкнецца раздражніць.
Эх! Мне б на волі той пажыць!..

З МІРУ ПА НІТАЧЦЫ

верш-загадка

Дзіўны звер ёсць на планеце —
У Манголіі, Тыбеце...

Ён увесь не па закону:
Постаць, горб — як у бізона,

І амаль такі ж здаровы.
Галава ж, як у каровы.

Каб не змерз у маразы —
Поўсць з ангорскае казы,

Аж звісае па баках.
Рогі ўзяў ён ад быка.

Ззаду доўгі конскі хвост
У звярыны той адрос.

Да таго ж дзівак штодня
Рохкае, нібы свіння.

Маю я спытаць намер:
Як завецца гэты звер?

(як — ецпэвае dэвƆ)

ВОВАЧКА Ў ЗВЯРЫНЦЫ

У звярынцы шустры Вова
Вельмі частым госцем быў,
І зусім не выпадкова
Ён гарэзнікам праслыў.

Кажа тыгр сваёй тыгрыцы:
— Гэта ж Вова! А яго
І настаўніца баіцца —
Ён гарэза — ого-го!

Можа нават і на ўроку
Ён такое адмачыць,
Што настаўніцу ад шоку
Доўга прыйдзецца лячыць.

А нядаўна — ледзь паверыў!
Шчэ не бачыў гэткіх спраў:
Супраць нашага вальера
Ён ваўка за хвост цягаў.

Вось да тыграў Вова крочыць...
Тыгр пасунуўся назад,

За гарэзай пільна сочыць,
Бо прыйшоў у заняпад.

Напалохаўся да скону.
Вова ж кажа тыгру: «Стой,
Не дрыжы, я вас не трону,
Не благі ў мяне настрой»!

ЯК МУХА МЯДЗВЕДЗЯ ЎРАТАВАЛА

Паводле апавядання В. Біанкі

Мядзведзь унадзіўся ў аўсы —
Смактаць іх з асалодаю.
Зграбае лапай каласы
І ў пашчу пхне з лагодаю.

Не столькі ён іх абгрызе,
Як што памне, патопча.
Ляжыць нягоднік абы-дзе
Ды з чаўканнем вуркоча.

«Ну, я ж цябе заб'ю, нягоднік! —
За стрэльбу ўзяўся паляўнічы. —
Апошні раз ты прыйдзеш, шкоднік!» —
І ў поле крочыў ваяўніча.

На дрэва ўзлез, пачаў чакаць,
Калі ласун заявіцца,
Як прыйдзе ён аўсы смактаць...
Ох, будзе, будзе каяцца!

Прыйшоў, нарэшце, абібок.
Стары ружжо сваё нацэліў,

Ды толькі ўзяўся за курок,
Як то на мушку муха села.

На муху дзьмухнуў паляўнічы,
Ды ўсё ж было далёка дзьмуць.
«А каб цябе нячысцік знішчыў!» —
Хацеў рукой яе змахнуць.

Пад дзедам хруснула галлё,
Знянацку моцна грымнуў стрэл.
Таптыгін з месца — і ў галоп
Не паімчаў, а паляцеў,

Забыўшыся смактаць аўсы,
Да скону дзён, на ўсе часы!
Так муха мішку ўратавала
Ад кулі-дуры, ад навалы.

МЯДЗВЕДЖАЯ ЛЕКАРКА

Фрося, сталая кабета,
Завіхалася на дачы.
То ж было ў разгары лета,
Час, канешне, быў гарачы.

Раптам быццам бы спружына
Таўханула яе ў плечы.

Азірнулася жанчына —
Божа ж мой! Куды б уцекчы?!

Ці то кінуцца дахаты?
Небяспечна і нязручна...
Аж за ёй мядзведзь калматы
Рыкае не вельмі гучна.

Супакоілася Фрося,
Бо мядзведзь глядзеў не злосна.
Нават, як ёй падалося, —
Дапамогі мішка просіць.

У поўны рост стаіць прад ёю,
Быццам бы парад прымае,
І распухлую, з крывёю,
Лапу перад ёй трымае.

Фрося сціснулася з духам,
Падыходзіць да мядзведзя,
Спаквaля, павольным рухам,
Каб зручней яе агледзець.

Бацюхны! Якая стрэмка!
Ды глыбока так улезла!
Ён, відаць, на шчэпках трэнькаў,
Музіцыраваў, балесны...

Галаву яна нагнула,
Учапілася зубамі,
Што ёсць сілы пацягнула
І дастала стрэмку з раны.

І застыла... Штой-та будзе?!
Штой-та зробіць касалапы?
Дзе ж то бачана, каб людзі
Медзвядзям лячылі лапы?!

А мядзведзь зусім свабодна
Галавою нахіліўся,
На яе глядзіць лагодна,
Нібы Фросі пакланіўся.

Тады Фрося вельмі хутка
З галавы здымае хустку,

Забінтоўвае балячку,
І мядзведзь, відаць, удзячны

Яшчэ ніжай нахіліўся,
Нібы зноўку пакланіўся.

Уздыхнуў нарэшце вольна
І пайшоў сабе павольна.

І падумала жанчына,
Калі трохі адпачыла:

«Нават дужых медзвядзей
Болькі гоняць да людзей.

Дзе ж у лесе медыцына?!
Вось і ўся на то прычына».

ВЫПАДАК НА ДАЧЫ

Паводле апавядання Н. Дзмітрыевай

Даведаўся я неяк выпадкова —
Аднойчы расказала мне суседка,
Клялася Валянціна чэсным словам,
Каб верыў ёй, хоць не было там сведкаў.
«Пад зіму ўжо заехала на дачу.
Нікога, цішыня! Ажно тужліва...
А ля суседкінага плоту бачу:
А Божа ж мой! Ды што гэта за дзіва?!

Здаецца, там прывязаны сабака
За шыю, немаведама калі.
Стаіць на задніх лапах, небарака,
А лапы ледзь кранаюцца зямлі.

Я падышла. А Божухна! То ж воўк!
Убачыла яго цьмяныя вочы,
І адступіла хуценька на крок:
Не дай Гасподзь, убачыць яго ноччу!

А ноччу воўк працягла, нема выў,
І час ад часу ўсхліпваў, як дзіця.
То болю крык амаль апошні быў,
Жах прабіраў ад гэтага выцця».

Вось раніцаю падышла жанчына,
Ад жалю вочы засціць ёй смуга.
А ў воўчых зла не бачыць Валянціна,
Там толькі невымерная туга,

Журба і боль слабеючага звера...
А што ж цябе сюды, галуба, прывяло?
Здалося ёй, што ён глядзіць з даверам,
Што здыме з яго жорсткае сіло.

Яна імгненна прыняла рашэнне:
«Каб вырашыць мне гэтую задачку,
І здзейсніць воўчае збавенне,
Я з хаты зараз прынясу кусачкі».

Драпежнік ён. Жывая ўсё ж істота.
Пазбавіць ад пакуты — вось прычына.
Чаму ваўка ўратаваць ад дроту,
Свабоду даць рашылася жанчына.

А воўк не мог крануцца нават з месца.
За доўгі час, што быў ён у няволі,
Пакутніку прыйшлося нацярпецца...
Без помачы ён выжыць бы не здолеў.

Воўк доўга шчэ супроць яе стаяў,
Удзячны, ён глядзеў збавіцельніцы ў вочы,
А потым, як нямнога ачуняў,
У родны лес, хістаючыся, крочыў.

ХВІЛІНКА

Адна хвілінка — як пясчынка,
Зусім кароткае імгненне —
Жыцця маленькая часцінка,
Сусвету момант утварэння.

То не губляй ты марна часу,
Вучыся берагчы хвілінку!
Імгненне гэтае, уласна, —
Жыцця імклівага іскрынка.

ВОСЬ ДЫК ПАСПАЧУВАЛА!

У бабулі сёння свята —
У яе дзень нараджэння!
І бабулечку заўзята
Віншавала ўнучка Жэня:

— Я люблю цябе, бабуля,
І віншую з гэтым святам,

Ты ў мяне яшчэ красуля!
І жыві гадоў багата!

Усе бабулю віншавалі
З юбілейным святам, потым
Песні добрыя спявалі,
Пілі-елі каву з тортам...

Але ж скончылася свята,
Разышліся ўсе дахаты.

А пасуды ж — як навала!
Трэба мыць яе нямала.

Зажурылася бабуля:
— І калі памыць змагу я?

Дапамогу ці параду
Атрымаць была б я рада...

Унучка ўраз дае параду:
— Заўтра можаш даць ёй рады!

Не спяшайся мыць пасуду,
Не ўцячэ яна нікуды.
Заўтра, заўтра, не на свята,
Часу мыць будзе багата.

ЭХ, ЗІМА, ЗІМА...

Усім, не маючым жытла,
Ці якога хоць вугла,

І катам, і псам бяздомным
Цяжка зімаваць, вядома.

Дрыжаць пад ніцаю вярбой
Васька-кот ды пёс Разбой.

Пёс пытае: «Калі ласка,
Ты чаму тут мерзнеш, Васька?»

— Разумееш, састарэўся,
Толькі на пячы і грэўся б.

Ды схуднеў, нібы Кашчэй,
Перастаў лавіць мышэй.
Хворы стаў ды слепаваты...
Вось і выкінулі з хаты.

Ну, а ты чаму бядуеш?
Чаму мерзнеш, галадуеш?

— Домік наш згарэў датла,
Вось не стала і жытла.

І бадзяюся па свеце,
Ні сагрэцца, ні паесці.

Вось такая мая доля...
Што тут, Васька, скажаш болей?!

Добра тоўстаму мядзведзю,
Спіць сабе ўсю зіму недзе.

Ух! Які мароз кусачы!
Адмарожу хвост няйначай.

Як жа цяжка зімаваці
Тым, хто не жыве ў хаце.

Сіл няма мароз трываць,
Гэтак можна і сканаць.

Хоць бы нейкі валанцёр
Распаліў для нас касцёр.

Ды ля вогнішча пагрэцца б,
Замярзае нават сэрца...

Ну, як вытрымаць нам гэта?
Эх! Хутчэй бы тое лета!

Слоўнік

Бадзяцца — вандраваць без пэўнага занятку.

Балесны — хворы, хваравіты.

Вантробы — унутраныя органы грудной клеткі і жывата.

Гарэзнік — весялун, непаседа.

Гід — праваднік-прафесіянал, які абслугоўвае турыстаў.

Дарадца — той, хто дае парады.

Дыхтоўна — вельмі добра, якасна.

Ёмка — зручна, выгодна.

Завіхацца — руплівa рабіць штосьці.

Заняпад — упадак сіл.

Злякацца — спужацца.

Змога — у дадзеным выпадку моцная стомленасць.

Зухавата — ліха, удала.

Кпіць — насміхацца.

Лагода — прыемны спакой, харaство.

Не благі — не дрэнны.

Нема — дзіка, роспачна (крычаць, галасіць).

Ні ўпынку, ні прыпынку — ні спакою, ні адпачынку.

Нязручна — тое, што не садзейнічае поспеху.

Паасобку — па адным, не разам.

Сіло — прыстасаванне для лоўлі жывёл, пастка.

Смуга — тое, што затуманьвае вочы.

Спаквaля — паволі, марудна.

Сталая кабета — дарослая жанчына.

Стрэмка — вострая, тонкая трэска, што залезла пад скуру.

Сумецца — збянтэжыцца, разгубіцца.

Сурвэтка — невялікі тканы выраб, якім упрыгожваюць стол.

Торкала — клявала.

Файны — добры, прыгожы, першасортны.

Фітанцыды — лятучыя рэчывы, якія знішчаюць бактэрыі і мікробы.

Змест

САМ З ВУСАМІ

Блізняты 4

Дзень нараджэння 5

У госці да бабулі 7

Дзе падзеліся цукеркі? 9

Каго лепш завесці? 11

Фітанцыды ў салаце 11

Як размаляваць вясёлку? 13

Сам з вусамі 15

Не, мамуля... 16

Тапкі 17

Праўда, ці не? 17

Памочнік 19

Чамучка 19

Навошта дзеду ежа? 21

Цырк 22

Купіце Мае папугая 22

Эльф 23

ВЫНАХОДНІК

Арол 25

Агеньчык 26

Анёл 27

Вясновы настрой 28

Што здарылася? 29

Вось гэта рыбалка! 30

Пашанцавала 32

Вынаходнік 33

Гадзіннік 34

Будзільнік вінаваты 35

Казёл адпушчэння 35

Не сябры мы... 36

Толькі прагуляўся 38

Не прыходзь без бацькі 38

Падарунак 39

Хованкі 40

Шчупак 41

Чароўнае слова 42

ЧАМУ БУСЕЛ СТАІЦЬ НА АДНОЙ НАЗЕ?

Бусел 45

Вераб'і на правадах 45

Ластаўка 46

Шпак-спявак 46

Йес! 48

Чаму бусел стаіць на адной назе? 50

Яшчарка 51

Нашто ёй грошы? 52

Свеціны рыбкі 55

Разумнік 56

Жальба 58

З міру па нітачцы 59

Вовачка ў звярынцы 60

Як муха мядзведзя ўратавала 62

Мядзведжая лекарка 63

Выпадак на дачы 66

Хвілінка 69

Вось дык паспачувала! 69

Эх, зіма, зіма... 71

Слоўнік 75